взаимосвязи стрессоустойчивости и мотивации достижений, что позволит организовать деятельность по формированию психологической готовности как интегрального образования, комплекса свойств личности, обеспечивающих переход от «оперативного покоя» к самостоятельной профессиональной деятельности.

Психологическую готовность к деятельности как элемент социально-профессиональной компетентности важно формировать и оценивать, поскольку во многом именно она способствует профессиональному становлению и развитию личности.

---


1. *Мельник, Ш.* Стрессоустойчивость. Как сохранять спокойствие и высокую эффективность в любых ситуациях / Ш. Мельник ; пер. с англ. С. Чиргинец. – М. : Изд-во «Манн, Иванов и Фербер», 2014. – 256 с.

2. *Реан, А. А.* Психология личности: социализация, поведение, общение : совр. учеб-практ. пособие / А. А. Реан. – СПб. : АСТ: Прайм-Еврознак, 2004. – 407 с. – (Психология – лучшее).

3. *Шварцер, Р.* Русская версия шкалы общей самоэффективности Р. Шварцера и М. Ерусалема / Р. Шварцер, М. Ерусалем, В. Ромек // Иностранная психология. – 1996. – № 7. – С. 71–76.


## АСОБА Ў КАНТЭКСЦЕ МЯСЦОВАЙ ГІСТОРЫІ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ЭКСПАЗІЦЫІ ЛЕПЕЛЬСКАГА РАЁННАГА КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ)


***С. В. Гаўрылава,***

*саіскальнік вучонай ступені Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*


Самым «пластычным» у адносінах змен і дапаўненняў у экспазіцыі краязнаўчага музея з’яўляецца раздзел сучаснага развіцця краю. Музейшчыкі спрабуюць пераасэнсаваць падзеі 2-й паловы ХХ ст., выявіць найбольш значныя падзеі пачатку ХХІ ст. для рэпрэзентацыі ў музеі і шукаюць «стрыжань» пабудовы (ці перабудовы) экспазіцыі, прысвечанай гэтаму перыяду. Адным з кірункаў, які выдзяляюць даследчыкі ў інтэрпрэтацыі гісторыі, з’яўляецца яе паказ праз асобу, праз індывідуальнага чалавека. Пры гэтым суб’ектамі музейнай камунікацыі стано-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вяцца як сучасны наведвальнік, так і чалавек іншага гістарычнага часу, што значна ўплывае на характар успрыняцця экспазіцыі [2, с. 219].

Праблема паказу гісторыі праз асобу стала прадметам дыскусій музеёлагаў яшчэ ў 1980-х гг., і была не ў апошнюю чаргу выклікана «антрапалагічным паваротам» у сацыяльна-гуманітарных навуках. Да пытання аб вызначэнні ролі асобы ў гісторыі і яе месца ў экспазіцыі спецыялісты звяртаюцца па сённяшні дзень. Айчынныя музейшчыкі, абапіраючыся на папярэдні вопыт, калі рэпрэзентацыя сацыялістычнага будаўніцтва не абыходзілася без дэманстрацыі здымкаў, грамат і пасведчанняў перадавікоў і рацыяналізатараў, змянілі ракурс разгляду суадносін чалавека і гісторыі: не асоба змяшчаецца ў падзейны кантэкст, а кантэкст будуецца вакол асобы. Сёння ў кожным краязнаўчым музеі рэспублікі ёсць экспазіцыйныя комплексы, прысвечаныя знакамітым землякам, ураджэнцам краю, і тым, хто зрабіў значны ўклад у развіццё таго ці іншага рэгіёну.

У 1983 г. у Лепельскім раённым краязнаўчым музеі была адкрыта сучасная экспазіцыя [4], якую завяршала «Зала культурнага будаўніцтва». Яе галоўныя героі – ганаровыя грамадзяне г. Лепеля, якія былі ўдзельнікамі ўстанаўлення Савецкай улады на Лепельшчыне і вызвалення раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны, арганізатарамі і кіраўнікамі партызанскага руху (А. Н. Полазаў, Маршал Савецкага Саюза В. І. Чуйкоў, Герой Савецкага Саюза У. Е. Лабанок і інш.). Пачэснае месца ў экспазіцыі займаюць матэрыялы пра Герояў Сацыялістычнай Працы А. Ф. Занько і Г. В. Мазала, заслужаных урачоў і настаўнікаў БССР, на прыкладзе дзейнасці якіх расказваецца аб развіцці адукацыі, медыцыны і сельскай гаспадаркі ў раёне. Пазней экспазіцыю дапоўнілі экспанаты, якія рэпрэзентавалі развіццё мясцовага тэатральнага мастацтва (самадзейны народны тэатр «Пошук» Лепельскага раённага Дома культуры і тэатральнае аддзяленне Лепельскай школы мастацтваў). Вынікам даследчыцкай дзейнасці супрацоўнікаў музея стала прадстаўленне наведвальнікам матэрыялаў пра ўраджэнцаў Лепельшчыны, якія дасягнулі поспехаў у прафесійнай дзейнасці і зрабілі значны ўнёсак у развіццё навукі, медыцыны, літаратуры,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтва рэспублікі, «упісаўшы» гісторыю малой радзімы ў кантэкст агульнадзяржаўнай.

Музейшчыкі праводзяць работу з мясцовым насельніцтвам, у выніку якой у экспазіцыі з'явіліся мемарыяльныя прадметы – асабістыя рэчы воінаў-інтэрнацыяналістаў, перададзеныя ў фонды музея іх роднымі: дакументы, здымкі, ваенная форма, узнагароды і іншае; звычайныя побытавыя рэчы: школьны малюнак, сшытак з экзаменацыйнай работай, атэстат аб атрыманні базавай адукацыі і інш. Шчымлівыя пачуцці выклікаюць такія экспазіцыі, дзе са школьным жыццём герояў суседнічаюць канспекты па падрыўной справе, Ганаровыя граматы за праяўленую мужнасць і воінскую доблесць пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку, абвесткі бацькам аб смерці сына (дачкі).

Пошук і збор матэрыялаў пра ўраджэнцаў Лепельшчыны ідзе бесперапынна, музейныя фонды папаўняюцца ўсё новымі прадметамі, а інфармацыйнае поле экспазіцыі пашыраецца матэрыяламі, прадстаўленымі з дапамогай выкарыстання тэхнічных сродкаў (інфармацыйны тэрмінал). На сайце музея ёсць звесткі пра ганаровых грамадзян г. Лепеля, якія атрымалі гэта званне ў 2000-я гг. (дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь У. І. Пракапцоў, намеснік Міністра фінансаў Рэспублікі Беларусь М. Л. Ермаловіч, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, былы дырэктар краязнаўчага музея А. С. Ханяк і інш.) [3]. Асобны комплекс у экспазіцыі музея прысвечаны развіццю фізічнай культуры і спорту Лепельшчыны ў пачатку XXI ст. і ўключае ўзнагароды, дакументы, здымкі ўдзельнікаў і пераможцаў рэспубліканскіх і міжнародных спаборніцтваў, чыя спартыўная кар'ера пачыналася з заняткаў у мясцовай спартыўнай школе (4-разовы чэмпіён Еўропы, чэмпіён свету па барацьбе самба С. Папоў, чэмпіён Беларусі па цяжкай атлетыцы, удзельнік Алімпійскіх гульняў у Лондане ў 2012 г. Я. Жарнасек і інш.).

У такіх экспазіцыях вызначальным з'яўляецца прынцып антрапацэнтрызму, калі акцэнт робіцца не на эканамічным развіцці краю, а ў цэнтр увагі экспазіцыянера трапляе чалавек з яго вялікімі і малымі дасягненнямі. Пагодзімся з тымі даследчыкамі, якія сцвярджаюць, што рэпрэзентацыя гісторыі праз



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асобу не можа быць расцэнена як паўнавартасная замена музейнай мадэлі гістарычнага часу ў цэлым, але можа значна ўзбагаціць экспазіцыю эмацыйна і зрабіць больш цікавай для розных катэгорый наведвальнікаў. Суаднясенне «агульнага і асабістага», а таксама ўвага да індывідуальнасці (так званая «персонификация») [1, с. 229], якая з'яўляецца суб'ектам сацыякультурных працэсаў, што адбываюцца ў рэгіёне і краіне (асабліва перыяду сучаснасці), з'яўляецца асновай стварэння запатрабаванай мясцовым грамадствам экспазіцыі.

1. *Кандаурова, Т. Н.* К вопросу о проблемах построения исторических экспозиций / Т. Н. Кандаурова // Современная историография и проблемы содержания исторических экспозиций музеев : по материалам «круглого стола», состоявшегося 18 мая 2001 г. в г. Орле / редкол.: В. Л. Егоров [и др.]. – М. : ГИМ, 2002. – С. 227–233.

2. *Каулен, М. Е.* Проблема личности в исторической экспозиции / М. Е. Каулен // Современная историография и проблемы содержания исторических экспозиций музеев : по материалам «круглого стола», состоявшегося 18 мая 2001 г. в г. Орле / редкол.: В. Л. Егоров [и др.]. – М. : ГИМ, 2002. – С. 219–226.

3. Почетные граждане Лепеля [Электронны рэсурс] // Лепельский районный исполнительный комитет. – Рэжым доступу: http://lepel.vitebsk-region.gov.by/ru/potchgrazhd/. – Дата доступу: 01.03.2016.

4. *Стельмах, А. В.* История Лепельского краеведческого музея [Электронны рэсурс] / А. В. Стельмах // Лепельский районный краеведческий музей. – Рэжым доступу: http://www.museum.lepel.by/history2.php. – Дата доступу: 04.04.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВЛИЯНИЕ ИНФОРМАЦИОННЫХ ТЕХНОЛОГИЙ НА РАЗВИТИЕ ИСКУССТВА

***П. В. Гляков,***
*кандидат физико-математических наук, доцент, заведующий кафедрой информационных технологий в культуре Белорусского государственного университета культуры и искусств*

Появление компьютера и информационно-коммуникационных технологий породило новую эпоху, получившую название